берасцянка, якая в..рнулася да нас з цёплых краёў у пачатку красавіка. Пад дрэвамі трымаюцца яшчэ апошні.. рэшткі снег.., а яна сп..вае с..бе ў захапле*(н/нн)*і *(Паводле В. Вольскага)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

Падкрэсліце зваротныя дзеясловы. Вызначце, у якім ладзе яны ўжыты.

Як адным словам па-беларуску называюцца цёплыя краі, куды адлятаюць на зіму пералётныя птушкі?

## § 16. Абвесны лад. Часы дзеяслова, утварэнне і ўжыванне часавых форм дзеяслова

**87.** Прачытайце схему.

**Формы абвеснага ладу дзеяслова**

- **значэнне** → дзеянні, якія адбываліся, адбываюцца ці будуць адбывацца
- **формы** →
  - **час** — цяперашні, прошлы, будучы
  - **асоба** — 1, 2, 3-я *(у цяперашнім і будучым часе)*
  - **лік** — адзіночны, множны
  - **род** — мужчынскі, жаночы, ніякі *(у прошлым часе)*

Што абазначаюць формы абвеснага ладу дзеяслова?

Якія формы маюць дзеясловы ў абвесным ладзе? Прывядзіце прыклады.

**88.** Прачытайце тэкст. Ці згодны вы з тым, што дрэвы ўздзейнічаюць на чалавека?

Я даверыўся чарам лесу. Прытуліўся да галінастай хваіны, адчуў яе смалісты пах і зажмурыў вочы. Дрэвы, як і людзі, розныя: ростам, колерам, формай. Я даўно прыйшоў да высновы,



Правообладатель Национальный институт образования

што дрэвы ўздзейнічаюць на чалавека. Паглядзіце на вярбу: яна заспакойвае душу, разнявольвае. А ўзнятыя галіны елкі лагодзяць сэрца і настройваюць[c] чалавека на добры лад *(Паводле М. Бусько)*.

Выпішыце з тэксту пяць дзеясловаў у форме абвеснага ладу. Вызначце іх час, лік, асобу, род (калі гэта магчыма).

Вусна дапоўніце тэкст паведамленнем пра тое, як уздзейнічаюць дрэвы на вас.

**89.** Прачытайце тэкст, устаўляючы прапушчаныя словы. Пры неабходнасці звярніцеся да схем з практыкавання 73.

### Часы дзеяслова

Дзеясловы ў форме ... часу паказваюць, што дзеянне адбываецца ў момант гутаркі. Яны адказваюць на пытанні ... і бываюць толькі ... трывання.

Дзеясловы ў форме ... часу абазначаюць дзеянне, якое адбывалася ці адбылося да моманту гутаркі. Яны адказваюць на пытанні ... і бываюць як ... , так і ... трывання.

Дзеясловы ў форме ... часу паказваюць, што дзеянне будзе адбывацца ці адбудзецца пасля моманту гутаркі. Яны адказваюць на пытанні ... і бываюць як ... , так і ... трывання.

Дапоўніце тэкст прыкладамі.

Формы **прошлага часу** дзеясловаў утвараюцца ад асновы інфінітыва пры дапамозе суфікса *-л-* (*-ў-*) і канчаткаў:

- для мужчынскага роду — нулявога: *адпачываў*□, *жыў*□;
- для жаночага роду — *-а*: *адпачывал*[*а*], *жыл*[*а*];
- для ніякага роду — *-а, -о*: *адпачывал*[*а*], *жыл*[*о*];
- для множнага ліку — *-і*: *адпачывал*[*і*], *жыл*[*і*].

У дзеясловах у форме прошлага часу мужчынскага роду, аснова інфінітыва якіх заканчваецца на зычны, суфікс *-л-* пасля зычнага не ўжываецца: *везці* — *вёз*, *бегчы* — *бег*, *берагчы* — *бярог*.



Правообладатель Национальный институт образования

**90.** Прачытайце. Словы якой часціны мовы выконваюць у вершы асноўную сэнсава-стылістычную ролю?

### Матчыны рукі

Хоць з той найбалючай разлукі
Мінуў немалы, гойны час,
Дзівосныя матчыны рукі,
Я зноўку спяваю[ф] пра вас…
Вы шылі, вязалі і ткалі,
Садзілі, палолі, граблі,
Насілі, збіралі, і жалі,
І пралі, і мылі, таўклі.

Вы смачна штодня гатавалі,
Збівалі, малолі, пяклі,
Пяшчоцілі нас і люлялі,
Да сонца і шчасця вялі.
У полі, у садзе, у хаце
Руплівыя ў шчырай сяўбе
Любілі вы вечную працу
І не шкадавалі сябе.

*М. Пазнякоў.*

Знайдзіце ў вершы пяць дзеясловаў у форме прошлага часу. Запішыце іх у формах розных лікаў і родаў. Абазначце суфіксы прошлага часу.

У з о р: *шылі — шыў (м. р.), шыла (ж. р., н. р.).*

У якіх формах дзеясловы ў прошлым часе маюць суфікс **-ў**? Суфікс **-л-**? Раскрыйце лексічнае значэнне дзеяслова *пяшчоцілі* шляхам падбору аднакаранёвых слоў.

***Звярніце ўвагу!***

Пры назоўніках, якія абазначаюць прафесіі, пасады, званні, форма роду дзеяслова залежыць ад полу асобы, на што ўказваюць уласныя імёны: *хірург Васільеў* ***аперыраваў*** (м. р.) — *хірург Васільева* ***аперыравала*** (ж. р.).

**91.** Запішыце сказы, ужываючы дзеясловы, што ў дужках, у форме прошлага часу.

1. На бацькоўскім сходзе *(выступіць)* дырэктар гімназіі Собалева Вера Сяргееўна. 2. Архітэктар Уладзімір Адамавіч Кароль *(распрацаваць)* праект Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». 3. Прафесар Казімірская Іна Іванаўна *(апублікаваць)* навуковы артыкул. 4. Малады аграном Высоцкая *(праверыць)* якасць насення. 5. Народны паэт Беларусі Янка Купала


Правообладатель Национальный институт образования

*(нарадзіцца)* у вёсцы Вязынка Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. 6. Валейбольны трэнер Таццяна Мікуліч *(падрыхтаваць)* школьную каманду да ўдзелу ў спартакіядзе.

Дзеясловы ў будучым часе маюць простую і складаную формы.

Форму **будучага простага часу** маюць дзеясловы закончанага трывання: *змайстраваць — змайструю, паліць — палью.*

Форму **будучага складанага часу** маюць дзеясловы незакончанага трывання: *майстраваць — буду майстраваць, паліваць — буду паліваць.*

Форма будучага складанага часу ўтвараецца шляхам спалучэння дзеяслова *быць* у форме будучага часу і неазначальнай формы дзеяслова незакончанага трывання: *буду мыць, будзеш мыць, будзе мыць.*

**92.** Утварыце ад прапанаваных дзеясловаў форму будучага часу 3-й асобы адзіночнага ліку. Запішыце па ўзоры, абазначце трыванне.

У з о р: *снедаць — будзе снедаць (незак. тр.); паснедаць — паснедае (зак. тр.).*

Прасіць, папрасіць; сустракаць, сустрэць; фарбаваць, пафарбаваць; ачышчаць, ачысціць; наведваць, наведаць.

**93.** Прачытайце тэкст. Растлумачце сэнс загалоўка. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.

## Хараство ў мініяцюры

Па даўняй традыцыі[л] на Вялікдзень многія беларусы фарбуюць яйкі. А нашы продкі да гэтага свята стваралі пісанкі — яйкі, распісаныя ўзорамі.

Аздаблялі яйкі рознымі спосабамі. Напрыклад, вадкім воскам на іх паверхні малявалі ўзор. Рабілі гэта шпількай — палачкай з цвічком на канцы. Калі воск станавіўся цвёрдым, яйка апускалі ў фарбавальнік. Звычайна выкарыстоўвалі адвары шалупіння цыбулі, грэчкі, настоі кары, шышак. Пасля воск счышчалі,



Правообладатель Национальный институт образования

і атрымлівалася ўзорыстае[сл] яйка. Пісанку націралі алеем або кавалачкам сала, і яна рабілася бліскучай. Старажытная традыцыя дэкарыраваць яйкі захавалася ў гарадскім пасёлку Сапоцкін Гродзенскага раёна *(Паводле А. Коршак)*.



Запішыце абзац, змест якога адпавядае фотаздымку, замяняючы дзеясловы ў форме прошлага часу дзеясловамі ў форме цяперашняга часу. Падбярыце сінонім да слова *дэкарыраваць*.

**дэкары́раваць**

**94.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Абгрунтуйце сваю думку.

Мы робім вароты — утыкаем у зямлю лазовыя дубцы. Дзелімся на дзве[м] каманды. Чэсь гуляе нападаючым у другой камандзе. Я адразу прыкмячаю, што мяч нібы прывязаны да яго ног.

Як толькі я атрымліваю мяч, кідаюся ў атаку. На мяне наступаюць па два-тры абаронцы, але я лёгка абыгрываю іх і з ходу б'ю па варотах. Праўда, не зусім моцна і дакладна. Варатар, даўганогі Віцька, забірае мяч.

І вось ужо Чэсь на поўнай хуткасці імчыцца з мячом да нашых варот. Я бягу яму наперарэз. Але ён пасуе другому іграку на левы край, а сам робіць рывок у цэнтр і там атрымлівае мяч. Наш варатар кідаецца ў ногі, ды позна. Чэсю паціскаюць руку, віншуюць з першым голам.

Але тут я разыгрываюся, і мячы адзін за адным ляцяць у вароты праціўніка. Калі лік стаў 6 : 4 на нашу карысць, Чэсь спыніў гульню. Потым падышоў да мяне і сказаў:

— А ты, Саша, добра гуляеш! Я капітан нашай школьнай каманды. Мы хутка будзем гуляць з загорскімі футбалістамі. Вось каб ты ў нашай камандзе выступаў! Мы б з табой хутка сыграліся. Тады б паказалі загорцам дзе ракі зімуюць! *(Паводле М. Зарэмбы)*.

Вусна перакажыце тэкст ад 3-й асобы, замяняючы дзеясловы ў форме цяперашняга часу дзеясловамі ў форме прошлага часу *(Хлопцы рабілі вароты — утыкалі ў зямлю лазовыя дубцы...)*.



Правообладатель Национальный институт образования

- Растлумачце правапіс ***ы*** пасля прыставак.

У якім значэнні ўжыты ў тэксце дзеяслоў *пасаваць*? Прывядзіце прыклады ўжывання гэтага дзеяслова ў іншых значэннях.

Раскрыйце значэнне фразеалагізма, ужытага ў апошнім абзацы тэксту.

## § 17. Змяненне дзеясловаў I і II спражэнняў

**95.** Прачытайце табліцы.

**I спражэнне дзеясловаў**

| Асоба | Адз. лік | Мн. лік |
|---|---|---|
| 1-я | *купля[ю]* | *купля[ем]* |
| 2-я | *купля[еш]* | *купля[еце]* |
| 3-я | *купля[е]* | *купля[юць]* |

**II спражэнне дзеясловаў**

| Асоба | Адз. лік | Мн. лік |
|---|---|---|
| 1-я | *купл[ю]* | *куп[ім]* |
| 2-я | *куп[іш]* | *куп[іце]* |
| 3-я | *куп[іць]* | *куп[яць]* |

Як змяняюцца дзеясловы ў форме цяперашняга і будучага простага часу?

У якой форме канчаткі дзеясловаў I і II спражэння супадаюць? У якіх формах дзеясловы I і II спражэння маюць розныя канчаткі?

Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім і будучым простым часе абвеснага ладу называецца **спражэннем.**

У залежнасці ад асабовых канчаткаў адрозніваюць дзеясловы I і II спражэння.

| Лік | Асоба | I спражэнне | II спражэнне |
|---|---|---|---|
| Адзіночны | 1-я | *-у (-ю)* | *-у (-ю)* |
| | 2-я | *-еш (-эш, -аш)* | *-іш (-ыш)* |
| | 3-я | *-е (-э, -а)* | *-іць (-ыць)* |
| Множны | 1-я | *-ём (-ем, -ом, -ам)* | *-ім (-ым)* |
| | 2-я | *-еце (-яце, -аце)* | *-іце (-ыце)* |
| | 3-я | *-уць (-юць)* | *-аць (-яць)* |



Правообладатель Национальный институт образования